# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВА

УДК 94:[792.096+7.096+ 796.096](4)(73)

*У. А. Трапянок*

## З гісторыі станаўлення сусветнага радыётэатра

*Аўтар артыкула ставіць пад сумненне існуючыя даты пачатку гісторыі радыётэатра, зафіксаваныя ў энцыклапедыі «Тэатральная Беларусь» і ва ўласнай манаграфіі. Уведзены ў навуковы зварот новы фактaлагічны матэрыял, вызначаны даты з'яўлення сусветнага, амерыканскага і еўрапейскага радыётэатраў.*

***Ключавыя словы:*** *радыётэатр, радыёп'еса, рэпрэзентатыўны ўзровень, трансляцыя, драматургія, радыё, мастацкае вяшчанне, ЗША, Еўропа.*

*U. Trapianok*

## From the history of the world radio theater formation

*The author of the article calls into question the existing dates of the beginning of the history of the radio theater recorded in the encyclopedia "Theatrical Belarus" and in his own monograph; introduces new factual material into the scientific circulation, determines the dates of the appearance of world, American and European radio theaters.*

***Key words:*** *radio theater, radio play, representational level, broadcasting, drama, radio, artistic broadcasting, USA, Europe.*

З'яўленне радыё на стыку XIX–XX стст. садзейнічала фарміраванню новых акустычных арт-практык, трансфармацыі традыцыйных мастацтваў у сферы віртуальнай рэальнасці. У працэсе спалучэння тэхналагічных і творчых распрацовак, тэатральных дасягненняў і новых сродкаў мастацкай выразнасці, звязаных з аўдыяльным спосабам успрымання, узнік радыётэатр, які з часам стаў унікальнай мастацкай з'явай і, на нашу думку, адным з самых масавых мастацтваў XX ст. Нягледзячы на папулярнасць, актуальным застаецца пытанне навуковага асэнсавання радыётэатра ў нацыянальным і сусветным маштабе.

Радыётэатр як з'ява культуры з розных пазіцый разглядаецца ў даследаваннях Н. А. Гааг [1], І. А. Папова [2], В. М. Шэіна [5; 6], Р. Дж. Грэя II [8] і інш. У выніку аналізу існуючых нешматлікіх матэрыялаў, прысвечаных радыётэатру, уласных даследаванняў, сабраных у манаграфіі «Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі» [4], прыходзім да высновы, што ў навуковых крыніцах прыводзяцца розныя даты пачатку

функцыянавання радыётэатра як сусветнай мастацкай арт-практыкі. Паўстае праблема выяўлення даты зараджэння радыётэатра, якую можна было б лічыць адпраўным пунктам фарміравання «акустычнай формы тэатральнага мастацтва, у якой аўтарскі калектыў праз уласцівыя для радыё сродкі выказвання займаецца стварэннем і трансляцыяй радыётвораў, у аснову якіх пакладзена радыёдраматургія, адаптаваная для аўдыяўспрымання літаратура, музычны твор» [Там жа, с. 150].

*Мэта артыкула* – вызначэнне даты з'яўлення радыётэатра ў сусветнай медыяпрасторы. Зварот да англамоўных матэрыялаў, факталогія якіх упершыню падаецца ў беларускім навуковым полі, пашырыў магчымасці даследавання. Сярод задач артыкула, аб'ектам якога абраны сусветны радыётэатр, – выяўленне найменняў першых арыгінальных п'ес і іх пастаноўшчыкаў у радыёэфіры, вылучэнне ўзроўняў функцыянавання дэбютных узораў радыётэатра, удакладненне дат з'яўлення сусветнага, амерыканскага і еўрапейскага радыётэатраў.

Нагадаем гістарычны факт: удасканаленне перадачы гуку на адлегласць пры дапамозе радыёхваляў адбывалася з канца XIX ст. да 1914 г. [10]. Да пачатку 1920-х гг. радыё ад сродку па абмене ваеннай інфармацыі пераўтварылася ў аўдыяльную крыніцу па перадачы інфармацыі і музыкі для шырокай аўдыторыі (грамадзянскага насельніцтва). Вызначальнымі функцыямі радыё сталі інфармаванне, асвета і забава, згодна з якімі пэўную эфірную долю займала мастацкае вяшчанне, у тым ліку радыётэатр.

Даследчык І. А. Папоў адзначаў, што гісторыя мастацкага радыёвяшчання пачалася з «традыцый антычнага тэатра, народных хароў, рытуальных песнапенняў і аратарскай прозы» з іх багацейшым вопытам слоўнай і гукавой творчасці, улічаных і сінтэзаваных радыёмастацтвам [2, с. 14]. На нашу думку, больш правільна будзе сцвярджаць, што менавіта тыя традыцыі, пра якія ўзгадвае навуковец, пакладзены ў аснову комплексу спецыфічных сродкаў мастацкай выразнасці радыётэатра, што ўбірае ў сябе агучанае слова, гук, музыку. Гэта трыяда ва ўмовах тэхналагічнага пераўтварэння фарміруе ў выніку ўнікальныя ўзоры акустычнага мастацтва, даступныя для масавай аўдыторыі з 1920-х гг.

В. М. Шэін сцвярджае, што радыётэатр узнік у 1924 г. у Вялікабрытаніі, калі лонданская радыёстанцыя перадала ў эфір радыёдраму «Небяспека» Р. Х'юза [6, с. 290]. Прывядзём яшчэ адну зафіксаваную дату – 16 лютага 1923 г., менавіта тады брытанская радыёвяшчальная карпарацыя Бі-Бі-Сі перадала ў эфір тры ўрыўкі з п'ес У. Шэкспіра «Юлій Цэзар», «Генрых VIII», «Шмат шуму з нічога» [4, с. 31].

У манаграфіі «Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі» годам з'яўлення сусветнага радыётэатра падаецца 1923 г., калі ў Паўночнай Амерыцы на радыёстанцыі WLW трансліравалася «першая арыгінальная радыёп'еса» (узята ў двукоссе па прычыне высвятлен-

ня першынства), што насіла рэкламны характар. 3 красавіка 1923 г. адбылася прэм’ера радыёспектакля «Калі прачынаецца каханне» («When love wakens») па аднайменнай п’есе Ф. Сміта, загадчыка праграм станцыі WLW [Там жа].

Прыведзеныя даты супярэчаць адна адной не толькі ў плане храналогіі, але і ў геаграфічным, паколькі ў якасці прыкладаў прыводзяцца радыётворы, пастаўленыя і выпушчаныя ў эфір на розных кантынентах.

Вывучэнне замежных матэрыялаў прывяло нас да высновы, што фарміраванне сусветнай мастацкай аўдыяльнай медыяпрасторы, а значыць і з’яўленне радыётэатра пачалося раней за 1923 г. Так, радыёстанцыя WJZ, размешчаная ў Ньюарку (амерыканскі штат Нью-Джэрсі), у 1922 г. пачала трансляцыі брадвейскіх мюзіклаў (узор рэпрэзентацыйнага ўзроўню радыётэатра, які прадугледжвае трансляцыю па радыё існуючых тэатральных работ). У тым жа 1922 г. акцёры Грэйс Джордж і Герберт Хейс сыгралі ў радыёспектаклі ў Сан-Францыска [10].

Са жніўня 1922 г. па пятніцах на радыёстанцыі ў Скенектадзі (амерыканскі штат Нью-Ёрк) пачалі трансліраваць штотыднёвую праграму з удзелам спецыяльнай трупы акцёраў (першая тэатральная радыётрупа ў ЗША [2, с. 16–17]) і выкарыстаннем гукавых эфектаў і музыкі. Можна меркаваць, што менавіта з гэтай праграмы пачалося засваенне сродкаў мастацкай выразнасці радыётэатра.

Адным з піянераў амерыканскага радыётэатра быў Фрэд Сміт, які працаваў на радыёстанцыі WLW у горадзе Цынцынаці. Яго творчая дзейнасць уключала адаптацыі існуючых п’ес для аўдыяўспрымання, напісанне арыгінальных радыёп’ес. Творчыя дасягненні Ф. Сміта ў станаўленні радыётэатра таксама звязаны з наданнем музыцы сюжэтнай лініі ў радыётворы і ўвядзеннем ролі вядучага. Выкананне п’ес уласнымі сіламі пачалося на радыёстанцыі ў Цынцынаці ў лістападзе 1922 г. Адна з першых пастановак называлася «Веер і два падсвечнікі», ролі ў якой выконвалі аўтар п’есы Мэры Макмілан, Ф. Сміт і адзін з яго памочнікаў [Там жа, с. 18]. Арыгінальная п’еса Ф. Сміта «Калі прачынаецца каханне», прэм’ерная трансляцыя якой адбылася на радыёстанцыі WLW у 1923 г., стала больш позняй работай, адпаведна, не можа быць першым арыгінальным драматычным творам, напісаным спецыяльна для радыё.

Як пісала даследчык Каміла Буш, амерыканская публіка ўспрыняла радыётэатр з вялікай прыхільнасцю, аднак новая аўдыяльная з’ява выклікала бурныя спрэчкі сярод тэатральных прадзюсараў, якія дакаралі мастацкае радыёвяшчанне ў падрыве продажу білетаў на сцэнічныя пастаноўкі [10]. Дарэчы, першыя амерыканскія радыёспектаклі былі скіраваны ў тым ліку і на камерцыйны прыбытак радыёстанцыі.

Цікавымі, на наш погляд, для даследавання гісторыі радыётэатра з'яўляюцца матэрыялы Рычарда Дж. Хэнда і Мэры Трэйнар. Аўтары прыводзяць прыклады радыёпастановак 1920-х гг., узгадваюць факт прамой трансляцыі з аўдыторыі каледжа ў Каліфорніі ў 1914 г. Спасылаючыся на іншых гісторыкаў тэлерадыёвяшчання, Р. Дж. Хэнд і М. Трэйнар сцвярджаюць, што першай трансляцыяй у прамым эфіры ў жніўні 1922 г. была пастаноўка радыёстанцыі WGY (горад Скенектадзі, штат Нью-Ёрк) драмы «Воўк» Юджына Уолтэра [9, p. 26]. Прадстаўленне стала магчымым пасля звароту ў тым жа годзе тэатральнага акцёра Эдварда Х. Сміта да праграмнага дырэктара радыё WGY Коліна Хагера з прапановай адаптаваць тэатральныя спектаклі для радыё. К. Хагер згадзіўся пры ўмове, што ніводная з п'ес, якая будзе трансліравацца ў эфіры, не перавысіць хронаметраж 40 мінут, паколькі слухачы не гатовыя ўспрымаць больш доўгія праграмы. У выніку была праведзена работа па адаптацыі трохактовай п'есы для радыётрансляцыі ў акрэсленым часавым прамежку, ролі ў якой выканалі Э. Х. Сміт і іншыя нанятыя акцёры. Пастаноўка «Воўк» аказалася настолькі паспяховай, што К. Хагер заказаў серыю п'ес для трансляцыі па радыё. У 1922–1923 гг. у эфіры WGY выйшлі 43 адаптаваныя для радыё сцэнічныя пастаноўкі [Там жа]. Па сутнасці, штомесяц у эфіры трансліравалася ў сярэднім па тры работы прадукцыйнага (стваральнага) узроўню радыётэатра, што было, на нашу думку, унушальнай колькасцю па тых часах.

Больш за тое, супрацоўнікамі радыёстанцыі ў Скенектадзі прадпрымаліся спробы па з'яўленні ў эфіры арыгінальнай радыёп'есы. Так, у 1923 г. радыёстанцыя WGY, драматычныя перадачы якой гучалі ў Нью-Ёрку і Вашынгтоне, правяла конкурс на найлепшую радыёп'есу і абяцала прыз пяцьсот долараў. Па ўмовах творчага спаборніцтва «сюжэт п'есы павінен быць простым і ніякім чынам не закранаць спрэчных праблем» [2, с. 20].

Яшчэ адным цэнтрам развіцця амерыканскага грамадскага радыё ў пачатку 1920-х гг. быў горад Пітсбург (штат Пенсільванія), дзе вяшчанне пачалося 2 лістапада 1920 г. Даследчык І. А. Папоў у 1980-я гг. задаўся пытаннем, ці не ў гэтым населеным пункце адбываліся першыя вопыты «мікрафона ў тэатры, хаця б і вымушаныя» [Там жа, с. 16]. Варта звярнуць увагу на адметны факт у яго даследаваннях, які можа прэтэндаваць на вызначэнне першага твора сусветнага радыётэатра рэпрэзентацыйнага ўзроўню, – менавіта ў Пітсбургу 9 мая 1921 г. мікрафон быў устаноўлены на сцэне тэатра Дэвіса па той прычыне, што не было завершана будаўніцтва радыёстудыі.

Пытанне, пастаўленае І. Паповым, можна разглядаць шырэй: «Ці не ў Пітсбургу адбылося з'яўленне радыётэатра?». Зыходзячы з матэрыялаў К. Буш, у 1921 г. у амерыканскім горадзе Пітсбургу ў эфіры радыёстанцыі KDKA трансліраваўся скетч «Сельская лінія па адукацыі» («A Rural

Line on Education») [10]. Кароткі твор названы К. Буш правобразам першай англамоўнай «п'есы» (у двукоссе ўзята па прычыне недасканаласці і кароткай формы), спецыяльна напісанай для перадачы па радыё. Сюжэт пабудаваны на тэлефоннай размове паміж двума фермерамі, якіх пастаянна перарывалі ахвотнікі скарыстацца тэлефоннай лініяй. Нягледзячы на невялікі па працягласці хранаметраж, твор быў разыграны ў радыёстудыі некалькімі выканаўцамі, на нашу думку, ён можа прэтэндаваць на першы арыгінальны радыёспектакль у радыёэфіры (прадукцыйны ўзровень). Значыць, гісторыя амерыканскага радыётэатра бярэ пачатак з 1921 г.

У еўрапейскім радыёэфіры эксперыменты з трансляцыяй драмы праводзіліся з 1922 г. Як стала нам вядома, 17 кастрычніка 1922 г. у радыёэфіры Вялікабрытаніі прагучаў фрагмент п'есы «Сірано дэ Бержэрак» Э. Растана [9, p. 26]. У лютым 1923 г. Брытанская радыёвяшчальная карпарацыя перадала ў эфір тры ўрыўкі з п'ес У. Шэкспіра, дыялогі перад мікрафонам выканалі запрошаныя тэатральныя акцёры. 28 мая 1923 г. па брытанскім радыё ў поўным аб'ёме прагучала п'еса У. Шэкспіра «Дванаццатая ноч». Да канца года былі агучаны іншыя п'есы англійскага класіка, увага да якіх у Англіі і ЗША не знікала нават са з'яўленнем арыгінальных п'ес для радыётэатра. 15 студзеня 1924 г. у радыёэфіры карпарацыі Бі-Бі-Сі (Вялікабрытанія) трансліравалася арыгінальная радыёдрама «Небяспека» Р. Х'юза [4, с. 31]. Першынство п'есе прадукцыйнага ўзроўню прыпісваюць па прычыне захаванасці тэксту, аднак у храналагічным парадку яна не з'яўляецца першай драмай, агучанай па радыё.

Станаўленне еўрапейскага радыётэатра адбывалася і ў іншых краінах. На радыё Францыі, як адзначаў Рычард Дж. Грэй II, у першыя два гады існавання (1922–1924) радыёпастановак трансліравалася нямнога. Адной з першых п'ес на французскім радыё прагучала «Марэмота» (Marémoto) Г. Жэрмінэ і П. Кузі [8, p. 14]. У 1924 г. у Францыі прайшоў конкурс на найлепшы драматычны твор для радыё, што сведчыла пра актыўнае станаўленне жанру ў Еўропе [4, с. 31].

Першым радыёспектаклем, які трансліраваўся на нямецкім радыё 24 кастрычніка 1924 г., быў «Zauberei auf dem Sender» («Магія на перадатчыку») Ганса Флеша [8, p. 14].

Гісторыя польскага радыётэатра бярэ пачатак ад 29 лістапада 1925 г., калі ўпершыню ў эфіры прагучала радыёдрама «Варшавянка» паводле С. Выспяньскага ў адаптацыі праграмнага кіраўніка Польскага радыё А. Кашына [3, с. 232]. Інсцэніроўка раскрыла новыя магчымасці радыётэатра – выкарыстаны акустычныя эфекты, якія, як слова і музыка, з'яўляліся выразнымі сродкамі мастацкага радыёвяшчання.

Да сярэдзіны 1920-х гг. у сусветнай медыяпрасторы адбылося не толькі засваенне комплексу сродкаў мастацкай выразнасці радыётэа-

тра, але і значнае пашырэнне меж яго прысутнасці. У Канадзе стварэнне радыёпастановак пачалося ў 1925 г. Нацыянальныя радыёвяшчальныя сеткі CNR, CRBC і CBC былі ў авангардзе вытворчасці і эксперыментаў з радыёспектаклямі, спрыялі навучанню новай творчай справе шматлікіх канадскіх прафесіяналаў тэатра, а таксама забяспечвалі аўдыторыю разнастайным тэатральным аўдыякантэнтам [7]. На шырокі вытворчы паток у Канадзе ў другой палове 1920-х гг. было пастаўлена стварэнне радыёсерыялаў. У Ванкуверы на нацыянальным радыё CNRV у 1926 г. выйшаў першы серыял «Ігракі» (CNRV Players) паводле тэксту Джэка Гілмара, які прадзюсіраваў штотыднёвыя трансляцыі. Серыял уключаў адаптацыі твораў Шэкспіра, іншых еўрапейскіх і амерыканскіх п’ес, творы мастацкай літаратуры, а таксама арыгінальныя тэксты [Там жа].

У ЗША з 1925 г. пачалася трансляцыя серыяла «Сям’я Смітаў» (The Smith Family), названага першай «мыльнай операй» на радыё [8, p. 235].

Расійскі радыётэатр рэпрэзентатыўнага ўзроўню распачаў дзейнасць 6 лютага 1924 г., калі перадавалі з Вялікага тэатра оперу П. Чайкоўскага «Яўген Анегін» [1, с. 158]. Першая радыёп’еса «Вечар у Марыі Валконскай» прагучала ў эфіры 25 снежня 1925 г. Нягледзячы на тое, што тэкст яе не захаваўся, менавіта гэтая дата лічыцца афіцыйным днём нараджэння расійскага радыётэатра [Там жа, с. 159].

Станаўленне беларускага радыётэатра адбылося ў другой палове 1920-х гг., крыху пазней, чым у згаданых у артыкуле краінах, але па тым жа прынцыпе спалучэння тэатральных традыцый, тэхналагічных магчымасцей і ўвасаблення ў радыётворах характэрных сродкаў мастацкай выразнасці. Нацыянальная радыёдраматургія, як і ў іншых дзяржавах, развівалася шляхам адаптацыі існуючых літаратурных твораў ці з’яўлення арыгінальных п’ес. Правобразам беларускай радыёдраматургіі стала інсцэніроўка Ц. Гартнага «Чорт і баба», якая прагучала ў 1928 г. падчас трансляцыі творчага вечара, прысвечанага беларускаму мастацтву [5]. Названы год перадачы ў эфір узору рэпрэзентатыўнага ўзроўню можна назваць афіцыйнай датай з’яўлення беларускага радыётэатра.

Такім чынам, з улікам таго, што радыётэатр функцыянуе на двух узроўнях – рэпрэзентатыўным (рэпрадукцыйным) і прадукцыйным, годам станаўлення акустычнай формы тэатральнага мастацтва можна лічыць той, калі драма, незалежна ад спосабу яе стварэння (узроўню), упершыню прагучала ў эфіры.

Амерыканскі радыётэатр зарадзіўся ў 1921 г., калі ў Пітсбургу адбыліся першыя трансляцыі драмы па радыё. Фарміраванне комплексу сродкаў мастацкай выразнасці радыётэатра адбывалася аднachасова ў некалькіх гарадах ЗША. Паралельна з адаптацыяй тэатральных работ для перадачы сродкамі радыё ішло ўкараненне арыгінальных радыёп’ес.

Улічваючы прыведзеную фактaлогію, можам сцвярджаць, што еўрапейскі радыётэатр зарадзіўся ў 1922 г. Станаўленне мастацкага ра-

дыёвяшчання на кантыненце адбывалася амаль адначасова ў Францыі, Германіі, Польшчы, Расіі. Беларусь далучылася да трансляцыі драмы па радыё ў 1928 г.

Паколькі першыя эфірныя выхады спектакляў у сусветнай медыяпрасторы адбыліся ў 1921 г., менавіта гэты год можна лічыць пачатковым у гісторыі сусветнага радыётэатра.

У заключэнне адзначым, на пачатку развіцця радыётэатр засноўваўся на выкарыстанні дыялогаў, музыкі і гукавых эфектаў, сённяшнія тэхнічныя магчымасці дазваляюць шматслойна адлюстроўваць паслядоўнасць эпізодаў радыёперадачы.

1. *Гааг, Н. А.* Рождение радиотеатра / Н. А. Гааг // Вестн. ВГУ. Серия : Филология. Журналистика. – 2012. – № 1. – С. 157–163.

2. *Попов, И. А.* Почему «город» пал?: Страницы истории американского радиотеатра : моногр. / И. А. Попов. – М. : Искусство, 1984. – 152 с.

3. *Трапянок, У. А.* Зараджэнне польскага радыётэатра і яго функцыянаванне на сучасным этапе / У. А. Трапянок // Культура: открытый формат – 2015 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2015. – С. 231–234.

4. *Трапянок, У. А.* Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2019. – 208 с.

5. *Шэін, В. М.* Радыётэатр / В. М. Шэін // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – 1996–2004. – Т. 13 : Праміле – Рэлаксін / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 2001. – С. 235–236.

6. *Шэін, В. М.* Радыётэатр / В. М. Шэін // Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. – 2002–2003 / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск, 2003. – Т. 2 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 290–291.

7. English-Language Radio Drama [Electronic resource] // The Canadian Encyclopedia. – Mode of access: https://www.thecanadianencyclopedia.ca/en/article/english-language-radio-drama. – Date of access: 29.01.2023.

8. *Gray II, Richard James.* French Radio Drama from the Interwar to the Postwar Period (1922–1973) / Richard James Gray II ; Faculty of the Graduate School of The University of Texas at Austin. – The Univ. of Texas at Austin, 2006. – 267 p.

9. *Hand, Richard J.* The Radio Drama Handbook : Audio Drama in Context and Practice / Richard J. Hand, Mary Traynor ; Continuum International Publishing Group. – New York ; London, 2011. – 241 p.

10. *Bush, Kamilah.* 100 Years of Radio Drama [Electronic resource] / by Kamilah Bush // Portland Center Stage at the Armory. – Mode of access: https://www.pcs.org/features/brief-history-of-radio-plays. – Date of access: 29.01.2023.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 27.02.2023.